ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1982
24
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 23 (1361)

Выходзіць раз у тыдзень

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### 60-ГОДДЗЮ ЎТВАРЭННЯ СССР

прысвяцілі цыкл выставак «У сузор'і братніх рэспублік» супрацоўнікі універсітэцкай бібліятэкі. Аб гістарычным, сацыяльным, навуковым і культурным развіцці РСФСР, Латвійскай, Беларускай, Эстонскай ССР ужо расказалі падборкі кніг. Зараз экспануецца літаратура аб Казахстане.

І. БАРДЗІЯН.

### ІНІЦЫЯТАРАМІ КАНФЕРЭНЦЫІ

«Дыялектыка нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў сучасным міжнародным руху», якая праводзілася ў чытальнай зале інтэрната № 2, выступілі выкладчыкі кафедры філасофіі А. Г. Паўлава, Г. І. Часнакова, Л. П. Мухарская і студэнты III курса факультэта журналістыкі. У сяброўскай абстаноўцы адбыўся абмен думкамі па шырокаму колу пытанняў. Асабліва актыўнасцю вызначыліся студэнты аддзялення філасофіі А. Лойка, А. Старавойтаў, В. Байко, Штэфан Меніх, Ноак Андрэас і іншыя.

МАРСЕЛЬ РАЗАФІ,
студэнт журфака.

### ПЕРАД ПРАЦАЎНІКАМІ

падшэфнага саўгаса «Гарадок», што ў Уздзенскім раёне, з цікавай канцэртнай праграмай, якая складалася з народных беларускіх песень, выступіў фальклорны ансамбль Белдзяржуніверсітэта.

А. КАНЧАК,
студэнт мехмата.

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

сацспаборніцтва паміж студэнцкімі будаўнічымі атрадамі гістарычнага факультэта ў падрыхтоўчым перыядзе. Сярод васьмі факультэцкіх атрадаў лепшымі прызнаны СБА «Кастрычнік», які будзе працаваць у Карэльскай АССР, а таксама атрады «Глорыя» і імя Г. Дзімітрава, якія будуць дыслакавацца ў Віцебскай і Мінскай абласцях.

С. ДАРАШЭНКА.

### КАЛЕКТЫВЫ

мастацкай самадзейнасці ў дзень выбараў у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў прынялі ўдзел у канцэрце перад выбаршчыкамі на выбарчым участку № 29. Асабліва спадабаліся гледачам сольныя нумары, з якімі выступілі дырыжор аркестра народных інструментаў М. Прашко і студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі В. Лобан.

Э. АНІСЕНКА.



## СЕСІЯ... СЕСІЯ... СЕСІЯ...

Пройдзе зусім нямнога часу і будуць здадзены апошнія экзамены, на некаторы час пустымі стануць аўдыторыі. А пакуль у студэнтаў гарачая і адказная пара — сесія. Яе характэрная прыкмета — чарга каля экзаменацыйнай аўдыторыі; натоўп, у якім дзеляцца ўражаннямі тыя, хто ўжо здаў; спрэчкі ў пошуках адзінага правільнага адказу; узбуджаныя, радасныя, а парой і сумныя твары. Сесія!

**НА ЗДЫМКАХ: рыхтуюцца да адказу студэнты 6-й групы першага курса мехмата; упэўнена адказвае на пытанні старшага выкладчыка кафедры вышэйшай алгебры А. А. Шарамета Таццяна Сержанін.**

Фота **В. Шачака.**



## Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ШМАТТЫРАЖНАЙ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За актыўны ўдзел у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі ўзнагародзіць шматтыражную газету «Беларускі універсітэт» Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
І. ПАЛЯКОЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.**

23 чэрвеня 1982 года.
г. Мінск.

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

**Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі:**

**ЛАЗАКОВІЧ МІКАЛАЙ ВІКТАРАВІЧ**—механіка-матэматычны факультэт, навуковы кіраўнік акадэмік АН Літоўскай ССР **І. П. Кубілюс.**

**САЕЧНІКАЎ УЛАДЗІМІР АЛЯКСЕЕВІЧ** — фізічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **А. М. Саржэўскі.**

**БЕЛАЯ ГАННА УЛАДЗІМІРАЎНА** — хімічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Ф. М. Капуцкі.**

**СПЕРАНСКІ СЯРГЕЙ ДЗІМІТРЫЕВІЧ** — біялагічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Я. Ф. Лунец.**

**КАЗЛЯКОЎ УЛАДЗІМІР ЯГОРАВІЧ** — кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, навуковы кіраўнік акадэмік АН БССР **І. М. Ігнаценка.**

**РАМАНАЎ АНАТОЛЬ ФІЛІПАВІЧ** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік дацэнт **А. У. Пракураў.**

**Жадаем новых творчых поспехаў!**

### ДЭЛЕГАТ XIX З'ЕЗДА ВЛКСМ:

## «НЯМА ДЛЯ НАС БОЛЬШ ВАЖНАЙ ЗАДАЧЫ, ЧЫМ ЗАХАВАННЕ МІРУ НА ЗЯМЛІ...»

ПЕРШ за ўсё я хацеў бы падзякаваць усім камсамольцам універсітэта за аказаны мне гонар і давер'е прадстаўляць камсамольскую арганізацыю флагмана вышэйшай школы рэспублікі — Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна — на XIX з'ездзе ВЛКСМ.

Ужо прайшло больш месяца з тае пары, як закончыў работу XIX з'езд ВЛКСМ, а мне здаецца, што толькі ўчора мы, дэлегаты з'езда, пакінулі Крамлёўскі Палац... Уражанне, якое засталося ў сэрцы, настолькі хвалюючае і незабыўнае, што мне, напэўна, заўсёды будзе здавацца, што з'езд быў толькі ўчора. Цяжка і, бадай, немагчыма перадаць словамі ўвесь той эмацыянальны ўздым, святочны настрой, які панаваў на з'ездзе. Адным словам, было вельмі здорава адчуць, як пяць тысяч сэрцаў біліся ў адным рытме, нібы адно сэрца, зразумець маштабнасць камсамольскіх спраў у нашай краіне, сілу, моц камсамола.

Самым памятным для мяне і для ўсіх дэлегатаў з'езда было выступленне Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева. Мы ўсё адчувалі, разумелі, наколькі гэта важна, што іменна на такім маладзёжным форуме, як XIX з'езд ВЛКСМ, дзе прысутнічалі 140 замежных дэлегацый, размова ішла аб новых мірных ініцыятывах Савецкай дзяржавы, аб ролі моладзі ў барацьбе за мір.

Няма для нас больш важнай задачы, чым захаванне міру на зямлі,— гэта думка чырвонай ніткаю прайшла і ў справаздачным дакладзе ЦК ВЛКСМ, і ў выступленнях дэлегатаў і гасцей з'езда. Мы, камсамольцы, павінны заўсёды памятаць — і аб гэтым гаварылася на XIX з'ездзе ВЛКСМ,— што кожная наша справа, і вялікая і маленькая, няхай гэта выдатная вучоба ці ўдзел у СБА, навуковая работа ці ўборка бульбы, правядзенне мітынгаў салідарнасці ці шэфства над цяжкімі падлеткамі — усё гэта з'яўляецца нашым канкрэтным укладам ва ўмацаванне магутнасці нашай дзяржавы, а значыць і ў справу захавання міру на зямлі.

**А. РУХЛЯ,
сакратар камітэта камсамола універсітэта.**




Кожны тыдзень студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта атрымліваюць свежы нумар газеты «Беларускі універсітэт». І так — пачынаючы з чэрвеня 1922 года. 60 год...

Пачатак перыядычнага друку флагмана вышэйшай школы рэспублікі паклала газета «Голас рабфакаўца», першы нумар якой выйшаў у чэрвені 1922 года. Пасля газета насіла назву «Беларускі студэнт», «Шлях студэнцтва», «Ленінскім шляхам», «За бальшавіцкія кадры», «За пралетарскія кадры», «Кузня пралетарскіх кадраў» і іншыя. Па-рознаму называлася шматтыражка БДУ. Не ў назве справа. Яна шэсць дзесяцігоддзяў застаецца страсным летапісцам старэйшай ВНУ Беларусі, працягвае змагацца за далейшае паглыбленне і развіццё навуковых даследаванняў і іх усё больш цесную сувязь з вытворчасцю, павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы ў калектыве.

## Адрасы ўдарных спраў

# У ДОБРЫ ШЛЯХ

Студэнцкія гады — незабыўная пара жыцця. І куды б пасля ні закідваў лёс чалавека, якія б крутыя павароты ні прымушаў яго браць, цудоўны час студэнцтва будзе помніцца як самае каштоўнае, самае блізкае сэрцу. І, як відаць, не май студэнты такой магчымасці ўжо зараз, сёння парадаваць Радзіму канкрэтнымі працоўнымі справамі, якую прадастаўляюць студэнцкія будаўнічыя атрады, магчыма, не такім шматгранным было б студэнцкае жыццё. І, магчыма, не такі глыбокі след пакінулі б у душах маладых людзей гады, калі фарміруюцца характары, сталее грамадзянская свядомасць, выхоўваецца сучасны спецыяліст народнай гаспадаркі.

«Арганічнай састаўной часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу стаў трэці працоўны семестр. Работа ў студэнцкіх атрадах дапамагае кожнаму студэнту пазнаць вопыт калектыўнай працы, замацаваць на практыцы атрыманыя веды, загартаваць волю і характар. Мы па праву ганарымся самаадданай працай студэнцтва на будаўнічых пляцоўках і ў сельскай гаспадарцы...» Гэтыя словы аб працоўным патрыятычным руху студэнцкай моладзі прагучалі ў дакладзе першага сакратара ЦК ВЛКСМ Б. М. Пастухова на XIX з'ездзе камсамола.

Вялікія і адказныя задачы стаяць перад байцамі універсітэта сёлета. На будаўнічых пляцоўках, калгасах і саўгасах, у розных кутках нашай неабсяжнай краіны ім прадстаіць асвоіць многія мільёны рублёў капіталаўкладанняў.

Сваё важкае слова яны скажуць і ў ажыццяўленні Харчовай праграмы. Як вядома, большасць аб'ектаў, дзе будуць працаваць універсітэцкія СБА, адносяцца да сельскай гаспадаркі. Даўно ўжо стала законам будатрадаўцаў — кожны баец СБА ў вольны ад работы на аб'екце час нарыхтуе для грамадскай жывёлагадоўлі не менш тоны кармоў. Вялікую дапамогу калгасам і саўгасам акажуць будатрады і на ўборцы ўраджаю.

Напружаныя працоўныя будні не перашкодзяць удзельнікам працоўнага семестра-82 выканаць свой важны абавязак — праводзіць грамадска-палітычную работу. Патрэбна дабіцца, каб дзейнасць агітбрыгад і лектарскіх груп, тэматычныя вечары і сходы, фестывалі і дні ўдарнай працы падпарадкоўваліся адной мэце: прапагандзе рашэнняў XXVI з'езда партыі, майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ. У цэнтры ўвагі грамадска-палітычнай работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў павінны быць дастойная сустрэча 60-годдзя ўтварэння СССР, правядзенне аперацый «Памяць» і «Няхай заўжды будзе сонца!», шэфства над сельскімі школамі і дзіцячымі дамамі.

Ужо не дні, а, можна сказаць, гадзіны аддзяляюць нас ад моманту, калі СБА узнімуць свае ветразі. У добры шлях, працоўны семестр-82! Плёну табе, баец СБА!

У ГЭТЫМ ГОДЗЕ мінскі гарадскі студэнцкі атрад аб'ядноўвае студэнтаў 8 вышэйшых навучальных устаноў, навучэнцаў Слуцкага медвучылішча і ГПТВ-34 — усяго 53 атрады. Зараз камандзіры і камісары рыхтуюцца да падпісання пашпартоў, яшчэ раз удакладняюць тэрміны, планы, абавязацельствы. Наладжваюцца кантакты з райкомамі камсамола і камсамольскімі арганізацыямі прымаючых прадпрыемстваў.

# РАМАНТЫКА ГАРАДСКІХ СБА

У саставе гарадскога атрада 2 камуністычныя СБА — імя герояў цаліны факультэта радыёфізікі і электронікі і атрад «Маладосць» механіка-матэматычнага факультэта.

У трэці раз застаецца ў гарадскім атрадзе Леанід Лясун — зараз камандзір СБА імя М. Мароза фізічнага факультэта. Байцы гэтага атрада даказваюць, што рамантыку заўсёды можна знайсці побач, дома. Усё залежыць ад таго, што лічыць рамантыкай!

На жаль, у фарміраванні гарадскіх атрадаў заўсёды існуюць цяжкасці. А колькі ж добрых спраў чакаюць нас тут, а не толькі за сотні кіламетраў. Шэфства над дзіцячымі дамамі і гарадскімі піянерскімі лагерамі, будаўніцтва пляцовак пры школах, будаўніцтва універсітэцкага гарадка, знаёмства з цікавымі лёсамі заслужаных людзей горада — не пералічыць усяго, што чакае байцоў гарадскіх атрадаў, не гаворачы аб асноўнай задачы — выкананні вытворчага задання.

Ужо сёння шмат цікавага зроблена гарадскімі СБА: агітбрыгада камуністычнага атрада імя герояў цаліны падрыхтавала выдатную літаратурна-музычную кампазіцыю, атрад заваяваў абсалютную большасць прызавых месц у конкурсах на VI універсітэцкім злёце студэнцкіх атрадаў. СБА «Маладосць» разгарнуў значную шэфскую работу ў дзіцячым доме № 2. Атрад медінстытута «Ваганты» парадаваў на аглядзе агітбрыгад кампазіцыяй, прысвечанай 112-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Атрады «Вікторыя» і «Альтаір» механіка-матэматычнага факультэта БДУ ўзялі шэфства над помнікам воінам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны ў пасёлку Масюкоўшчына.

Упэўнена, што гарадскі студэнцкі атрад будзе працаваць выдатна. Канешне, гэта ў многім залежыць ад ініцыятыўнасці нашых камандзіраў і камісараў, ад іх зацікаўленасці, перакананасці ў неабходнасці і карыснасці выконваемай работы. Бо калі яны вырашылі павесці за сабой байцоў — яны ў адказе за баявы дух, за настрой, за работу кожнага. І ад іх залежыць, як кожны баец будзе праз год разумець слова «рамантыка».

Кожны чалавек імкнецца штодзённа рабіць нешта добрае. А ў горадзе кожны крок студэнцкага атрада можа быць і добрым і карысным. Толькі не трэба шкадаваць сябе, свае сілы. Аддаючы сябе, мы атрымліваем узамен вялікае пачуццё карыснасці сваёй працы.

**А. НЕЖАВЕЦ,**
**камісар Мінскага занальнага штаба СБА.**

# ДАЕШ «ВЫДАТНА» У ПРАЦОЎНУЮ ЗАЛІКОЎКУ!

ЧЭРВЕНЬ — гарачая пара. Ідзе сесія. Завяршаецца падрыхтоўчы перыяд работы студэнцкіх атрадаў. Зусім мала часу засталося да пачатку працоўнага семестра, які пакажа, на што здольны студэнты нашага універсітэта, праверыць кожнага яго ўдзельніка ў вялікіх і складаных справах на будоўлях краіны, на палях і фермах.

Ва універсітэце сфарміравана 100 атрадаў агульнай колькасцю больш чым 3 тысячы чалавек. У гэтым годзе значна расшырылася геаграфія размяшчэння нашых атрадаў. Паявіліся новыя месцы дыслакацыі — Хабараўскі край, Цюменская вобласць, Башкірская АССР, Балгарыя. Байцамі нашых атрадаў сталі каля 100 замежных студэнтаў, якія навучаюцца ва універсітэце.

Камітэтамі камсамола і штабамі працоўных спраў усіх факультэтаў праароблена вялікая работа па падрыхтоўцы да трэцяга працоўнага семестра. Падрыхтаваны і абучаны актыў атрадаў, праведзены прафесіянальная падрыхтоўка і медагляд, прайшлі заняткі па курсу тэхнікі бяспекі. Шматлікія мерапрыемствы дазволілі лепш падрыхтаваць атрады да вядзення грамадска-палітычнай работы. Гэта конкурсы агітбрыгад, насценгазет, санбюлетэняў, куткоў па тэхніцы бяспекі, злёты студэнцкіх атрадаў на філалагічным факультэце і ФПМ, пяты універсітэцкі злёт СБА. Прачытана за гэты час 809 лекцый на прадпрыемствах і ў навучальных установах горада і вобласці, дадзена 108 канцэртаў сіламі агітбрыгад, выпушчана 235 насценгазет, праведзена каля 50 сустрэч з ветэранамі вайны і працы, аказана шэфская дапамога школам і дашкольным установам, адпрацавана на суботніках і нядзельніках больш 10 тысяч чалавека-гадзін. Вынікі гэтай работы скажуцца ў працоўны перыяд. У сацспаборніцтве ў падрыхтоўчы перыяд лепшымі прызнаны юрыдычны, гістарычны, механіка-матэматычны факультэты. Ніжэй сваіх магчымасцей працавалі штабы працоўных спраў фізічнага, геаграфічнага факультэтаў і ФПМ. Разам з тым хочацца адзначыць актыўнасць штабоў працоўных спраў філалагічнага, хімічнага факультэтаў і факультэта радыёфізікі і электронікі.

Зараз усім нашым атрадам неабходна замацаваць дасягнутыя вынікі і развіць іх далей. Яскравае, і хуткае ўзвядзенне народнагаспадарчых аб'ектаў — найпершая задача байцоў СБА. Дакладная арганізацыя работы, выкарыстанне перадавых метадаў, строгае выкананне **правілаў тэхнікі бяспекі на кожным працоўным месцы, добрасумленнае выкананне байцамі СБА сваіх абавязкаў — залог поспеху.**

Кожны баец СБА павінен памятаць, што ён прадстаўляе Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна.

**А. ЧУЛКОЎ,**
**начальнік штаба працоўных спраў універсітэта.**



Юнакі і дзяўчаты з 54 краін свету займаюцца зараз у Белдзяржуніверсітэце. 61 прадстаўніку ПНР, ЧССР, ГДР, МНР, Кубы, Партугаліі, Эфіопіі, Афганістана, Экватарыяльнай Гвінеі і Гвінеі, для якіх БДУ імя У. І. Леніна стаў другім домам, будуць уручаны сёлета дыпломы аб вышэйшай адукацыі. Эстафету дружбы, інтэрнацыяналізму, выдатнай вучобы перадаюць сённяшнія выпускнікі сваім малодшым сябрам, якім і надалей працягваць традыцыі братэрства, што склаліся ў студэнцкім асяроддзі.

Першакурснік механіка-матэматычнага факультэта Нгуен Ван Хіеў з В'етнама, які атрымаў зараз выдатна на экзамене па вышэйшай матэматыцы, добра ўсведамляе гэта.

Фота В. Шачака.





ШМАТЛЮДНА ў гэтыя дні ў залах універсітэцкай бібліятэкі. Яно і зразумела — ідзе сесія. Толькі абанемент вучэбнай літаратуры абслугоўвае штодзённа звыш чатырохсот студэнтаў. Тут можна атрымаць дапаможнікі па навуковаму камунізму, вышэйшай матэматыцы, журналістыцы — тэматыку цяжка пералічыць.

Як ні спяшаюцца дзяўчатыбібліятэкары, але тут, на выдачы вучэбнай літаратуры, заўсёды гаманлівая чарга. А вось у чытальных залах — цішыня. Толькі шэлест кніг, ды раз-пораз падыйдзе хто да кніжных паліц — адшукаць патрэбны твор Пушкіна, Коласа, Бальзака. У многіх студэнтаў гуманітарных факультэтаў гэта зала — самае любімае месца падрыхтоўкі да экзаменаў.

**НА ЗДЫМКАХ: у чытальнай зале гуманітарных факультэтаў; студэнтаў абслугоўвае старшы бібліятэкар абанемента вучэбнай літаратуры Алена Каракулька; да чарговага экзамена рыхтуецца другакурсніца філфака Ірына Куляшова.**

Фота **В. Шачака.**



**ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. КУПАЛЫ І Я. КОЛАСА**

# «З ГЛЫБІНЬ ЖЫВАТВОРНЫХ...»

БЕЛАЯ РУСЬ... Сінявокая, русакосая, сардэчная і гасцінная, ты — як і народ твой, спрытны і на працу і на песню. Колькі дала ты свету таленавітых сыноў і дачок, якія разнеслі па ўсёй зямлі тваю праўду і мову.

У гэтым годзе святкуеш ты юбілей лепшых з лепшых сваіх песняроў — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Гэта не проста стагоддзе, гэта век, век, поўны надзвычайных падзей, век узнёсласці чалавечага розуму.

І вось іменна цяпер, звяртаючыся да творчасці песняроў зямлі беларускай, усё больш разумееш, адкуль ідзе гэта працавітасць і сардэчнасць, гэта мэтанакіраванасць сучаснага чалавека. Усё адтуль, «з глыбінь жыватворных народнага духу».

Зараз усе знаходзяцца ў адным патоку падрыхтоўкі да свята. Гэта плынь нараджае сваю новую крынічку-задумку ў кожнага з нас, крынічку новага разумення творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.

І ў кожнага ўзнікае ўнутраная неабходнасць пазнання разнастайных колераў і адценняў гэтай творчасці, гэтай нашай спадчыны. Прыступкай да гэтага пазнання з'явілася цікавая сустрэча студэнтаў другога курса біялагічнага факультэта з дацэнтам кафедры беларускай мовы і літаратуры Уладзімірам Аляксандравічам Навумовічам. У час гутаркі мы даведаліся аб новых гранях таленту гэтых пісьменнікаў. І грані гэтыя зазіхацелі перад намі зусім новымі колерамі. І што вельмі важна, мы лепш уявілі і зразумелі гістарычныя абставіны, у якіх пісаліся творы, глыбей праніклі ва ўнутраны свет пісьменнікаў.

Шчыра падзяліўся з намі сваімі думкамі аб адлюстраванні творчасці беларускіх песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа ў мастацтве, графіцы, скульптуры, а таксама паказаў нам шэраг гравюр Анатоль Яўхімавіч Белы, выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў. Гэты чалавек заўсёды імкнецца данесці да нас пачуцці, думкі аб беларускай культуры, дае нам захапляючыя тэмы для роздуму, ідэі для новага пошуку.

Студэнты-біёлагі таксама падзяліліся тым, што іх вабіць у творчасці вялікіх беларускіх песняроў, чыталі іх вершы, урыўкі празаічных твораў, кожны ўносіў у размову штосьці сваё, асабістае.

З хваляваннем слухалі мы песні на словы Я. Купалы і Я. Коласа ў выкананні лепшых музычных калектываў Беларусі. Гармонія музыкі і слоў запаўняла душу, абуджала ў ёй самыя патаемныя струны, захапляла, зачароўвала. Асабліва купалаўская «Спадчына» ў выкананні ВІА «Песняры», якая яшчэ раз напомніла нам, што ў нашых руках бясцэнны скарб— спадчына, якую пакінулі нам нашы продкі. І наш святы абавязак — зберагчы яе.

**Т. ГАЎРУТА,**
**С. КРЫВУЛЬКА,**
**Т. ЮЗВЕНКА,**
**студэнткі біялагічнага факультэта.**

**ЗАХАВАНАСЦЬ БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ**

# *Кніга патрэбна неаднаразова*

ЗРАЗУМЕЛА, што да выпускнікоў ва універсітэце адносіны асаблівыя. Яны—той фокус, у якім канцэнтруецца плён пяцігадовых намаганняў прафесарска - выкладчыцкага і абслугоўваючага калектыву. І ў бібліятэцы выпускнікі карыстаюцца многімі льготамі. Наш калектыў імкнецца як мага лепш забяспечыць іх кнігамі, неабходнымі для навуковай работы і падрыхтоўкі да экзаменаў. Іх як правіла, пяцікурснікі могуць атрымаць без чаргі. Ім нават на поўны тэрмін выдаецца апошні экземпляр патрэбнага выдання, які маецца ў наяўнасці ў бібліятэцы. Колькасць кніг, выдадзеных на курс, значна павялічваецца. Выпускнікі маюць магчымасць працаваць у чытальнай зале для прафесарска-выкладчыцкага саставу і аспірантаў.

Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання спадзяюцца, што ў адказ на наш клопат выпускнікі будуць больш уважліва адносіцца да сваіх абавязкаў. Мы чакаем, што ўся літаратура, якая зараз знаходзіцца ў карыстанні пяцікурснікаў, будзе здадзена ў бібліятэку ў тэрмін. Дакладнае выкананне гэтай простай умовы мае для супрацоўнікаў бібліятэкі вялікае значэнне: нам патрэбна да вераснр падрыхтаваць камплекты літаратуры, неабходныя для комплекснага абслугоўвання студэнтаў у пачатку навучальнага года. Калі нехта ў час не здаў кнігу — яна можа не дайсці ў патрэбны тэрмін да вашага малодшага сябра, да таго, хто прыйдзе пасля вас. І яшчэ, калі чытач губляе бібліятэчную кнігу, ён павінен замяніць яе эквівалентнай. На жаль, нам прыносяць кнігі менш каштоўныя, менш патрэбныя ў навучальным працэсе, што таксама адмоўна ўплывае на забеспячэнне кнігамі студэнтаў.

Пры чарговым аглядзе абанементаў чытачоў высветлілася, што сярод 1470 выпускнікоў дзённага аддзялення, якія карысталіся паслугамі універсітэцкай бібліятэкі, маюць запазычанасць звыш 600 чалавек. Мы звяртаемся да іх і асабліва да юнакоў, якія, як паказаў вопыт мінулага года, часам разлічваюць з бібліятэкай не дапушчальна позна — пасля летніх збораў, — знайдзіце сярод шматлікіх «выпускных» клопатаў час, каб здаць у бібліятэку падручнікі і мастацкую літаратуру. Іх чакаюць вашы малодшыя калегі.

**З. ШАЛУПЕНКА,**
**галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання.**




# ПРЫХОДЗЬЦЕ ЗАЎТРА

„Бюракрат Кручынаў сядзеў за рабочым сталом і з разумным выглядам перакладваў паперкі з аднаго месца на другое. Калі ў адным месцы паперкі закончыліся, ён стаў перакладваць іх з другога месца на трэцяе.

У дзверы пастукалі. Нехта ўвайшоў і сказаў:

— Добры дзень.

Бюракрат Кручынаў стаў перакладваць паперкі з трэцяга месца на чацвёртае.

Праз паўгадзіны бюракрат Кручынаў, зрабіўшы ўважлівыя вочы, зірнуў на ўвайшоўшага. Перад ім стаяў сівенькі дзядок.

— Пагуляйце мінут пятнаццаць. Я заняты, — сказаў бюракрат Кручынаў і стаў перакладваць паперкі з пятага месца на шостае.

Праз паўгадзіны бюракрат Кручынаў паглядзеў на дзядулю, сказаў:

— У мяне абед, — апрануў паліто і пайшоў.

Пасля абеду дзядуля зноў стаяў ля стала. Бюракрат Кручынаў зірнуў на дзядулю і сказаў:

— Запаўняйце анкету. Узор — на сценцы. І стаў перакладваць паперкі з сёмага месца на восьмае.

Калі дзядуля запоўніў анкету, бюракрат Кручынаў паклаў яе перад сабой і паўгадзіны праглядаў напісанае. Потым сказаў:

— Няправільна , узор — на сценцы, — і стаў перакладваць паперкі з дзевятага месца на дзесятае.

— Прабачце,—баязліва спытаўся дзядуля, — а што няправільна?

Бюракрат Кручынаў зрабіў стомлены твар і сказаў:

— Дзе імя і імя па бацьку?

Бюракрат Кручынаў стаў перакладваць паперкі з дзевятага месца на дзесятае.

Праз паўгадзіны бюракрат Кручынаў зірнуў на дзядулю і сказаў:

— Мой працоўны дзень закончыўся. Прыходзьце заўтра».

...Рэдактар адклаў рукапіс, задумліва паглядзеў у акно, потым на аўтара — сівенькага дзядулю і сказаў:

— Нядрэнна, нядрэнна... Толькі вось са старыканам. Усё-такі сапраўды, як жа гэта ён імя і імя па бацьку ў анкету не запісаў?

— Але ж... — адкрыў было рот аўтар.

— Вось што, дружа, — сказаў рэдактар, — у мяне працоўны дзень закончыўся. Прыходзьце заўтра. Яшчэ раз паглядзім. Пагутарым...

# СУТЫЧКА

...Я прытаіўся. Ён не зводзіў з мяне насцярожанага позірку. Я зрабіў неасцярожны рух, і ён, адскочыўшы на два метры, прыгатаваўся да адбіцця атакі. Я пераставіў нагу і падаў корпус уперад. Ён праглядзеў гэты рух. Я наблізіўся да яго, затаіўшы дыханне, падрыхтаваўся да атакі... І ў гэты момант ён з крыкам кінуўся на мяне, збіў з ног і пабег у дальні кут. Прыйшлося ўсё пачынаць спачатку.

Я выпісваў вакол яго кругі і васьмёркі, рабіў адцягваючыя манёўры, з кожным крокам звужаючы траекторыю свайго руху. Здавалася, ён вырашыў змагацца да апошняга. Пераводзячы дыханне, я прыкінуў мае шансы на перамогу.

Ён быў разы ў чатыры лягчэйшы за мяне, быў слабейшы фізічна, але вызначаўся неверагодная рухомасцю. Акрамя таго, я ведаў, што ён выкарыстоўвае забароненыя прыёмы. Але мне таксама патрэбна была толькі перамога, прычым ад гэтага залежала маё далейшае жыццё.

Я загнаў яго ў кут. Нашы вочы сустрэліся, і я прачытаў у ягоных прысуд. Мне зрабілася страшна, але апошнім намаганнем волі я задушыў у сабе гэтае агіднае пачуццё... І схапіў яго за руку. У адказ ён паспрабаваў правесці «ўкушэнне», але я своечасова зблакаваў, выйшаў з лініі атакі, дакладным прыёмам кінуў яго на спіну і схапіў за нагу. Пачуў немы крык, але было позна...

...Праз тры хвіліны ўсё было скончана: мне нарэшце ўдалося надзець паўзуны на свайго паўтарагадовага сына. Перамога была за мной.

# АБ'ЯВЫ

Школа жыцця праводзіць набор вучняў па спецыяльнасці «Каваль свайго шчасця».

●

Вучу плаваць у малочных рэках.

●

Згушчаю фарбы. Касметолаг.

●

Куплю партфель рэдакцыі.

●

Алё! Мы шукаем таленты. Сааўтары.

# ДЫСЕРТАЦЫЯ

Невыразна гэтак памятаю, што некалі ўсё было інакш. Хадзілі мы ў кіно, тэатр... Памятаю, кнігі чыталі, спрачаліся... Здаецца, з сябрамі... Ну так, у нас жа тады яшчэ сябры былі, мы з імі яшчэ пад гітару спявалі. Даўно было...

Раней, бывала, прыйдзеш дамоў — у кватэры пах такі прыемны: духі, кветкі. Жонка сустракае...

А зараз?

Божа, за што мне такое жыццё? Сесці няма дзе — мэбля завалена перфалентамі, манаграфіямі. На вокнах некалі кветкі стаялі, зараз — колбы, рэторты...

Стаю, жую чэрствы хлеб, вочы слязяцца. Можа, думаю, Агату Крысці пачытаць? Шукаю ў шафе, там, дзе пакінуў кнігу —«Уводзіны ў тэорыю мностваў», «Вымярэнне дыпольных момантаў»...

— Лена! — крычу. — Ты не ведаеш, дзе Агата Крысці?

— Я яе на табліцу канстант памяняла, — адказвае з гонарам...

Эх, хутчэй бы яна закончыла сваю дысертацыю.

## З ФІЛАСОФСКАГА СШЫТКА

*З усіх сімулянтаў самыя небяспечныя тыя, якія сімулююць мысленне.*

*Спачатку было слова, потым зласлоўе.*

*Дык кім усё ж быць: самім сабой ці як усе?*

*Чым вузейшы лоб, тым шырэй самаўзвышэнне.*






## ФРАЗЫ

Службовая характарыстыка: Фядот, ды не той.

Плыў па плыні — і выйшаў сухім з вады.

Не ў кожнага хапае інтэлекту жыць чужым розумам.

Каменем спатыкнення абітурыента аказаўся граніт навукі.

Яму палец у рот не кладзі — высасе дысертацыю.

«Я захоўваю сваё добрае імя!» — сказаў ананім.

Колькі аўтарытэтаў падарвалі ўзрывы смеху.

Спецыяліст шырокага профілю — яго работа не лезе ні ў якія вароты.

Вечна зялёным лаўры не да твару.

Турыст стварыў сабе імя разьбой па дрэву.

«Вось жыццё — ні дня без радка!» — падумаў дырэктар, беручы ў рукі кнігу скаргаў.

Над выпускам Лірычна-Іранічнага ФакультэТа працавалі **Д. Новікаў** («Прыходзьце заўтра»), **У. Бялоў** («Сутычка»), **У. Дашук** («Дысертацыя», «З філасофскага сшытка»), **І. Сеін** («Аб'явы», «Фразы»), **М. Іваноў** (малюнкі).

**ДА ЮБІЛЕЮ РАДЗІМЫ**

# ФЛАГМАН ВНУ АРМЕНІІ

28 снежня 1920 года абнародаваны дэкрэт аб заснаванні Ерэванскага універсітэта. Савецкая ўлада дала народу вышэйшую школу новага тыпу, ажыццявіўшы жаданні прагрэсіўнай армянскай інтэлігенцыі.

Для аднаўлення народнай гаспадаркі маладой рэспублікі, развіцця адукацыі, навукі патрэбны былі высокакваліфікаваныя спецыялісты — іх магла рыхтаваць толькі вышэйшая школа. Першынец армянскіх ВНУ — Ерэванскі дзяржаўны універсітэт прыняўся за гэту ганаровую і адказную справу.

Дзякуючы пастаяннаму клопату партыі і ўрада за мінулыя шэсць дзесяцігоддзяў Ерэванскі дзяржаўны універсітэт непазнавальна ператварыўся, узмужнеў. Ён рос і развіваўся ў адпаведнасці з патрабаваннямі народнай гаспадаркі, навукі і культуры і ператварыўся ў буйны навуковы і вучэбны цэнтр рэспублікі, дзе рыхтуюцца кадры навуковых работнікаў і выкладчыкаў ВНУ.

Сёння на 16 факультэтах ЕДУ навучаюцца каля 8 тысяч студэнтаў, амаль 500 аспірантаў.

Ва універсітэце праводзяцца навуковыя даследаванні ў галіне прыродазнаўчых і грамадскіх навук. Шырокую вядомасць атрымалі вынікі навуковых распрацовак у галіне астрафізікі, фізікі, матэматыкі, механікі. Вялікую папулярнасць заваявалі даследаванні па праблемах квантавай фізікі, нелінейнай оптыкі, фізікі цвёрдага цела. Важнейшыя распрацоўкі вядуць вучоныя універсітэта ў галіне біяфізікі, біяхіміі, арганічнай хіміі. Немалы ўклад у развіццё навукі ўносяць даследаванні ў галіне армяназнаўства, праблем, якія распрацоўваюцца ў сувязі з гісторыяй і культурай армянскага народа і іншых народаў свету.

За 60 гадоў свайго існавання універсітэт даў краіне 40 тысяч маладых спецыялістаў, якія прымаюць актыўны ўдзел у камуністычным будаўніцтве, працуюць у Арменіі і іншых братніх рэспубліках.

**З НАШАЙ ПОШТЫ**

# ШКОЛА НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА

ЧАС НАШАГА знаходжання у Інстытуце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ імя У. І. Леніна канчаецца. Выкладчыкі палітэканоміі, што прыехалі ў Мінск з 57 вышэйшых навучальных устаноў дзесяці саюзных рэспублік, сёння яшчэ і яшчэ раз у думках праходзяць свой шлях у ІПК, падводзяць вынікі, вызначаюць каэфіцыент карыснасці сваёй вучобы. А ўспомніць і падсумаваць ёсць што.

Добрыя ўражанні пакінула большасць лекцый і спецкурсаў. Яны насілі творчы характар, вучылі новаму падыходу да распрацоўкі вучэбнай праграмы. Асабліва прыемна будзе ўспомніць, а ў практычнай дзейнасці выкарыстаць лекцыі прафесараў І. К. Смірнова, У. П. Уварава, М. Д. Колесава, І. Д. Прахарэнкі, В. А. Драздова і іншых выкладчыкаў. Кожны з іх у цыклах лекцый, у спецкурсах выказваў пэўны кірунак у навуцы. А гэта прымушала нас думаць, часам спрачацца, шукаць, сумнявацца, карацей кажучы, прымушала заняць тую ці іншую цвёрдую пазіцыю.

У навуцы няма нічога бясспрэчнага, аднойчы і назаўсёды дадзенага. Яна дынамічная, навуковы пошук бясконцы. Таму і былі цікавымі дыскусіі паміж выкладчыкамі і слухачамі. Кожны з выступаўшых быў арыгінальны ў сваіх меркаваннях, стараўся аргументіраваць сваю пазіцыю. Дыскусіі, арганізаваныя прафесарам І. Д. Прахарэнка і У. П. Уваравым, метадычныя семінары насілі творчы, глыбокі характар.

Слухачы ІПК выступалі з дакладамі, лекцыямі перад рознымі аўдыторыямі: працаўнікамі горада і вёскі, студэнтамі. Значную прапагандысцкую работу вялі А. М. Тур, М. С. Мазала, А. І. Роўбель, Т. Ц. Храмава.

Аднак, не толькі вучобай вызначалася наша знаходжанне ў ІПК пры БДУ імя У. І. Леніна. Мы часта наведвалі тэатры, палацы культуры, музеі. Знаёмства з багатай культурай брацкага беларускага народа, сустрэчы з пісьменнікамі і вучонымі Беларусі — усё гэта ўзбагачала кожнага з нас. Надоўга запомнім мы паездку ў Брэсцкую крэпасць-герой, у Хатынь, на Курган Славы. Праз пакуты, боль і няшчасці прайшоў беларускі народ. Прайшоў і перамог. І радасна нам было адчуваць непарыўнасць сувязі розных пакаленняў і народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы.

Жыццё інстытута — складаны, шматгранны працэс. Сёння, перад развітаннем з дарагой нам Беларуссю, хочацца падзякаваць кіраўніцтву ІПК, партыйнаму бюро інстытута, усім выкладчыкам за тое, што ўсе свае веды і сілы яны аддавалі нам.

**А. БЯЛЯЕЎ,**
**старшы выкладчык Саратаўскага дзяржаўнага універсітэта.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

24 чэрвеня 1982 г.

АТ 15343 Заказ 1220.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ